*Арэшка Т. Д.,*
*выкладчык Беларускага універсітэта культуры (г. Мінск)*

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКАРЫСТАННЯ КАМП'ЮТЭРНЫХ ВЫДАВЕЦКІХ СІСТЭМ У НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

У сувязі з развіццём камп'ютэрных тэхналогій апрацоўка тэкстаў і выдавецкія сістэмы ўступілі ў новую, больш высокую ступень свайго развіцця. Любы друкаваны матэрыял зараз не абыходзіцца без камп'ютэрнай апрацоўкі і камп'ютэрнай вёрсткі. Таму ўзнікла неабходнасць фарміравання ў студэнтаў культуралагічных спецыяльнасцей тэарэтычных ведаў і практычных уменняў у галіне прылажэнняў Windows, адказных за ўвод, апрацоўку, рэдагаванне і вёрстку тэкставай і графічнай інфармацыі, азнаямленне з тэхнічнымі сродкамі ўвода інфармацыі.

Курс "Камп'ютэрная апрацоўка тэкстаў і выдавецкія сістэмы" выкладаецца ў Беларускім універсітэце культуры для студэнтаў старэйшых курсаў спецыялізацыі "Інфармацыйныя сістэмы ў культуры", спецыяльнасцей "Культуралогія" і "Літаратурная работа". Яго змест складаюць наступныя тэмы:

— камп'ютэрныя тэхналогіі ў выдавецкай справе;

— тыпы фарматаў і відарысаў;

— камп'ютэрная апрацоўка тэкставай інфармацыі;

— апрацоўка графічнай інфармацыі;

— сканіраванне і распазнаванне тэкставай інфармацыі;

— камп'ютэрная вёрстка.

На занятках студэнты знаёмяцца з асноўнымі настольнымі выдавецкімі сістэмамі: WORD, PageMaker, Photoshop, FineReader. Заключным вынікам іх працы з'яўляецца падрыхтоўка да друку канкрэтнага літаратурнага матэрыялу з малюнкамі, зробленымі самастойна з дапамогай графічных рэдактараў, або адсканіраванымі. Для некаторых студэнтаў — гэта магчымасць падрыхтаваць да друку асабістыя літаратурныя творы.

Курс "Камп'ютэрная апрацоўка тэкстаў і выдавецкія сістэмы" уносіць значны ўклад у фарміраванне граматных, высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне культуры.

## *Літаратура*

*Бураўкін А. Г.* Інфармацыйныя тэхналогіі ў мастацтве / Пад рэд. М. А. Ярмаша. — Мінск, 1999. — 250 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ